Грамовіч Ірына Міхайлаўна[1].

# ФЕСТЫВАЛІ І КОНКУРСЫ, ЯК ФОРМА ЗАХАВАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАГА МУЗЫЧНАГА МАСТАЦТВА

У артыкуле даецца невялікі экскурс у гісторыю станаўлення і развіцця фестываляў і конкурсаў. Вызначаюцца мэты і задачы іх правядзення на сучасным этапе. Аўтар спыняецца на найбольш значных фестывалях і конкурсах, акцэнтуе ўвагу на актуальнасці іх правядзення для выяўлення і падтрымцы адораных студэнтаў у сферы культуры і мастацтва, абмену творчым і педагагічным вопытам, захавання нацыянальнага музычнага мастацтва.

The article gives a little history of formation and development of festivals and competitions. Defines the goals and objectives of their conduct at the present stage. The author stops at the most important festivals and competitions, draws attention to the relevance of their conduct to identify and support talented students in the field of culture and art, and the creative exchange of teaching experience, to preserve the national musical art.

W artykule przedstawiono niewielki uzupełniający problem, dotyczący historii powstawania i rozwoju festiwali i konkursów. Określono cele i zadania ich przeprowadzenia na współczesnym etapie. Autorka zajmuje się najbardziej znaczącymi festiwalami i konkursami, skupia uwagę na aktualności ich przeprowadzenia, w celu wykrycia i wsparcia utalentowanych studentów w sferze kultury i sztuki, podkreśla wymianę twórczego i pedagogicznego doświadczenia, ochronę ludowej sztuki muzycznej.

Існуе шмат формаў і спосабаў захавання і папулярызацыі лепшых ўзораў музычнага мастацтва. Значэнне тэрміна "фестываль" у слоўніку С.І. Ажэгава трактуецца наступным чынам: "Фестываль-шырокая грамадская, святочная

---

[1] кандыдат педагагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры народна-песеннай творчасці

сустрэча, якая суправаджаецца праглядам дасягненняў якіх-небудзь відаў мастацтваў" [4, 634].

Фестываль, як культурная акцыя ў вобласці выканальніцкага майстэрства, стварае максімальныя ўмовы для прыцягнення як прафесіяналаў так і аматараў у розных відах мастацтва. На працягу пэўнага часу, а гэта звычайна тыдзень, адбываюцца серыі канцэртаў, творчыя сустрэчы, майстар-класы, конкурсы, якія маюць на мэце прапаганду нацыянальнага музычнага мастацтва, абмен творчым вопытам, удасканаленне прафесіяналізму. Вельмі часта ў межах фестываля праводзяць конкурсы, у якіх мастацкія калектывы і асобныя выканаўцы маюць магчымасць паказаць самыя лепшыя свае творчыя праграмы з выкарыстаннем цікавага рэпертуару.

Заглянуўшы ў гісторыю, можна адзначыць, што фестывалі пачалі сваё існаванне яшчэ ў старажытным грэчаскім тэатры. Тэатралізаваныя прадстаўленні сярэднявечча, такія як містэрыі і карнавалы, адлюстроўвалі рэлігійныя сюжэты і ладзіліся на рэлігійныя святы. Карнавалы былі формай народнай культуры, дзе пераважала пераапрананне ў касцюмы, выкарыстоўваліся маскі, бутафорныя атрыбуты, дэкарацыі.

Першыя фестывалі паявіліся ў Велікабрытаніі ў 1709 годзе і былі звязаны з царкоўнай музыкай. У краінах Еўропы яны распаўсюдзіліся з другой паловы XVIII стагоддзя.

Свае карані, этапы станаўлення і развіцця мае і фестывальны рух у Беларусі. Культурная праграма з гульнямі, песнямі і танцамі прыцягвала шмат людзей і спрыяла вырашэнню эканамічных задач. У некаторых крыніцах даюцца сведкі аб тым, што правядзенне кірмашоў адбывалася ўжо ў XVII стагоддзі ў Бешанковічах, што на Віцебшчыне, а традыцыя правядзення Вялікага Аненскага кірмаша была зацверджана Сапегай Казімірам прыкладна ў XVIII стагоддзі, у мястэчку Зельва.

Адраджэнне фестываляў, як з'явы культурнага жыцця ў Беларусі, пачалося на рубяжы XIX і XX стагоддзяў. Зварот да беларускай нацыянальнай культуры ў другой палове 50-х гадоў аказала свой адбітак на фестывальны рух. Фестывалі савецкага часу насілі палітычны, асветніцкі, выхаваўчы і прапагандысцкі характар.

Асаблівай формай папулярызацыі аматарскай творчасці ў савецкі перыяд з'яўляліся агляды мастацкай самадзейнасці. Яны праводзіліся на раённым, абласным, рэспубліканскім і на ўсесаюзным узроўні. Асаблівую значнасць мелі такія фестывалі як Міжнародны фестываль моладзі і студэнтаў у Маскве, Дэкады нацыянальнага мастацтва рэспублік СССР у Маскве, Усесаюзныя фестывалі самадзейнай мастацкай творчасці. Дзякуючы такім

фестывалям, конкурсам і аглядам адбываўся працэс знаёмства з культурай іншых народаў, дэманстрацыяй дасягненняў у вобласці выканальніцкага майстэрства, павышаўся прафесійны ўзровень калектываў. Фестывалі садзейнічалі абмену творчага вопыту, папаўненню рэпертуара.

Нягледзячы на складанае эканамічнае становішча ў краіне ў часы перабудовы, колькасць фестываляў 1990-я-пачатку 2000-х гадоў павялічвалася. Гэта азначала, што фестывалі мелі важнае значэнне ў культурным жыцці і з'яўляліся важным сродкам падтрымкі народнага мастацтва з боку дзяржавы.

Дзякуючы выканальніцкім конкурсам штогод з'яўляліся новыя імёны і калектывы ў музычным мастацтве. Пераможцы такіх конкурсаў узнагароджваліся дыпломамі Лаўрэятаў розных ступеняў, каштоўнымі прызамі і прэміямі .

На сучасным этапе правядзення фестываляў і конкурсаў не менш актуальна і дапамагае вырашаць наступныя задачы:

- узраджэнне, захаванне, развіццё нацыянальных культур і замацаванне міжнароднага супрацоўніцтва;
- захаванне і ўзбагачэнне музычнага мастацтва;
- знаёмства з лепшымі творчымі калектывамі, устанаўленне творчых кантактаў з лепшымі з іх;
- стымуляванне і развіццё творчасці музычных калектываў, хароў, вакальных і інструментальных ансамбляў;
- стварэнне ўмоў для падтрымкі і развіцця творчых зносін паміж мастацкімі калектывамі:
- павышэнне прафесійнага майстэрства;
- далучэнне да супрацоўніцтва з творчымі калектывамі лепшых дзеячаў культуры і мастацтва.

Студэнты факультэта музычнага мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва прымаюць актыўны ўдзел у гарадскіх, рэспубліканскіх і міжнародных фестывалях і конкурсах. Яны выкарыстоўваюць любую магчымасць для ўдзелу у такіх акцыях. Гэта адна са неад'емных частак авалодання прафесіяй, магчымасць павысіць сваё выканальніцкае майстэрства, падмурак для самарэалізацыі.

Калектывы і індывідуальныя выканаўцы факультэта рэалізоўваюць свой творчы патэнцыял на такіх прэстыжных фестывалях і конкурсах, як Міжнародны фестываль-конкурс "Баян-акардыён, гармоніка" г.Масква, Расійска-беларускі адкрыты студэнцкі агляд-конкурс «Как на речке было на Фонтанке», конкурс эстраднай песні "Белазаўскі Акорд" г. Жодіна, конкурс

выканаўцаў эстраднай песні ў межах X Маскоўскага Міжнароднага фестываля славянскай музыкі, Міжнародны фестываль "Моладзь за Саюзную Дзяржаву" г. Растоў-на-Дану, Рэспубліканскі радыёконкурс маладых выканаўцаў "Маладыя таленты Беларусі" (г. Мінск), Міжнародны конкурс-фестываль "Нарва зажигает звезды", (г. Талін, Эстонія), Рэспубліканскі фестывль-конкурс маладых выканаўцаў на ўдарнай установцы "Барабанны біт" (г. Мінск), адкрыты міжрэгіянальны конкурс музыкантаў-выканаўцаў і інструментальных ансамблей "ГАРА" (г. Варонеж, Расія), рэспубліканскі фестываль-конкурс "Спадчына"(г.Мінск), Міжнародны конкурс "Дельфийские игры", Міжнародны конкурс "Рождественские ассамблеи" (г. Санкт-Петербург), Міжнародны конкурс выканаўцаў на народных інструментах "Малахитовая шкатулка", Міжнародны фестываль "Казачья столица" (г. Москва), Міжнародны фестываль творчасці моладзі «Фольклорные вдохновения» (г. Лодзь, Польшча), Всероссийские ассамблеи оркестрово-хоровых ансамблей (г. Москва), Міжнародны конкурс "Візерунки Прикарпаття" (г. Дрогобыч), Міжнародны творчы форум-конкурс мастацтваў "Петербургская весна" (г. Санкт-Петербург), Рэспубліканскі фестываль-конкурс харавой музыкі "Пеўчае поле", Міжнародны фестываль музычнага мастацтва "Звіняць цымбалы і гармонік" (г. Паставы) і інш.

Рэспубліканскі фестываль харавога мастацтва "Пеўчае поле" 11-12 ліпеня 2015г. ладзіў Мінскі абласны выканаўчы камітэт у г. Мяделе. Праграма фестываля-конкурса была вельмі насычаная. Яна ўключала выставу-кірмаш вырабаў народных рамёстваў, конкурсную праграму вакальна-харавых калектываў розных абласцей Рэспублікі Беларусь, канцэртныя праграмы прафесійных і аматарскіх народна-песенных калектываў.

Мядзельская зямля прымала народны вакальны ансамбль "Берагіня" (г. Стоўбцы), народны вакальны ансамбль "Аліра" (г. Копыль), народную харавую капэлу работнікаў культуры "Светач" (г. Старабарысаў), народны камерны хор "Преображение" (г. Барысаў), народны ансамбль народнай песні "Рыцкі куфэрак" (г. Маларыта), народны вакальны гурт "Гармонія" (г. Камянецк), народны ансамбль народнай песні "Кросны" (г. Віцебск), вакальны гурт "Кампанелла" (г. Лепель), народны хор "Крыніца" (г. Жлобін), народная харавая капэла (г. Глыбокае) і інш. Усяго 26 калектываў.

Кожны калектыў прадэманстраваў разнастайную конкурсную праграму.

Выконваліся як беларускія народныя песні, так і песні беларускіх кампазітараў. Адметным бокам выступленняў было тое, што ў рэпертуары былі выкарыстаны рэгіянальны песенны фальклор. Поспехам карысталіся праграмы з яркімі харэаграфічнымі пастаноўкамі.

Асаблівае месца у спісе конкурсаў займае Расійска-Беларускі адкрыты студэнцкі агляд-конкурс «Как на речке было на Фонтанке». У кастрычніку 2015 года ён праходзіў ужо чацьвёрты раз. Удзельнікамі конкурсу з'яўляліся студэнты і навучэнцы музычных сярэдніх спецыяльных і вышэйшых устаноў Беларусі і студэнты музычных устаноў Расіі на базе кафедры мастацтва народных спеваў Санкт-Пецярбургскага інстытута культуры.

Геаграфія ўдзельнікаў вельмі шырокая. У розныя гады ў конкурсе прымалі ўдзел вучэбныя калектывы і сольныя выканаўцы Тамбоўскага дзяржаўнага музычна-педагагічнага ўніверсітэта, Маскоўскага інстытута культуры, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Санкт-Пецярбургскіага інстытута культуры, Белгародскага дзяржаўнага інстытута мастацтваў і культуры, Санкт-Пецярбургскага музычнага тэхнікума імя М.П. Мусаргскага, Валагодскага музычнага каледжа, Гродзенскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў, Астраханскага каледжа культуры, Мінскага дзяржаўныага каледжа мастацтваў, Пскоўскага абласнога музычнага каледжа, Наваполацкага дзяржаўнага музычнага каледж і інш.

Галоўная мэта і задачы праекта:

- развіццё сістэмы мастацкай адукацыі, укараненне інавацыйных тэхналогій у працэсе навучання;
- замацаванне сістэмы мастацкага і эстэтычнага выхавання падрастаючага пакалення;
- захаванне і развіццё лепшых традыцый нацыянальных пеўчых культур;
- выяўленне і падтрымка адораных студэнтаў у сферы культуры і мастацтва;
- абмен творчым і педагагічным вопытам.

Конкурс праходзіць у два туры у намінацыях фальклорныя і народна-стылізаваныя спевы (сола, ансамблі).

Конкурс у аднолькавай ступені арыентаваны як на канкурсантаў, так і на выкладчыкаў і гасцей. У межах конкурса адбываюцца сольныя канцэрты ансамбляў, хароў і сольных выканаўцаў. У час яго правядзення прадстаўляецца магчымасць правядзення адкрытых заняткаў і майстар класаў выканальніцкага і педагагічнага майстэрства для абмену вопытам па метадычным праблемам этнавакальнага навучання і выхавання.

Студэнты –удзельнікі гэтага конкурса прымаюць вельмі актыўны ўдзел у практычных занятках такіх вядомых выкладчыкаў, як загадчыка кафедры рускага народнага песеннага мастацтва, прафесара В.М. Сівовай, прафесара Маскоўскага інстытута культуры В.В. Бакке аб жанравай і стылістычнай разнастайнасці рускага народна-песеннага выканальніцтва, выкладчыкаў Кузнецовай М.А., Т.В. Шасцінай па праблемах дыялектнага вымаўлення,

Т.С. Малчанавай аб арганізацыі і правядзенні фальклорна-этнаграфічнай практыкі.

Конкурс з'яўляецца ўнікальным інавацыйным адукацыйным праектам па падтрымке, развіццю і прапагандзе народнага песеннага мастацтва, які спалучае формы канцэртна-выканальніцкай практыкі, дэманстрацыі творчых дасягненняў і кароткатэрміновага павышэння кваліфікацыі.

Вялікую ролю ў захаванні музычнага мастацтва адыгрывае Міжнародны фестываль-конкурс "Звіняць цымбалы і гармонік". Гэта своеасаблівая творчая лабараторыя, дзе адбываецца абмен прафесійным майстэрствам і вопытам, вывучаюцца і прапагандуюцца выканальніцкія стылі, фарміруюцца школы навучання, нараджаюцца цікавыя праекты і ідэі.

З пачатку правядзення фестывалю ў яго мерапрыемствах прынялі ўдзел каля пяцісот аматарскіх калектываў і трохсот індывідуальных выканаўцаў з розных краін свету. Праграма фестываля ўключае конкурс творчых калектываў і выканаўцаў на народных інструментах "Хто каго?", выставы народных рамёсел, канцэрты прафесійных і аматарскіх калектываў. На прэзентацыях творчых лабараторый у межах фестывалю высвятляюцца пытанні развіцця і захавання народнага выканальніцтва.

Сярод пастаянных удзельнікаў фестываля-конкурса пастаўскі інструментальны ансамбль "Паазер'е", у склад якога ўваходзяць выкладчыкі Пастаўскай школы мастацтваў. Гэты калектыў – пераемнік традыцый Груздаўскага цымбальнага аркестра, каторы ў сваю чаргу ўнаследваў музычную выканальніцкую школу Антонія Тізенгаўза XVIII стст.

З вялікім поспехам на пастаўскім фестывалі выступаў ансамбль народнай музыкі "Баламуты" Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Студэнцкі калектыў з'яўляецца захавальнікам народнай музычнай спадчыны. У яго рэпертуары беларускія народныя танцы, полькі, песні. Мастацкі кіраўнік ансамбля К.С. Трамбіцкі разам са студэнтамі імкнецца на падставе збірання і вывучэння музычнага фальклора як мага больш дакладна захоўваць манеру выканання беларускай народнай музыкі, яго стылістыку і выканальніцкае майстэрства.

Сапраўды аб фестывалях і конкурсах можна пісаць бясконца. Яны не ўгасаюць, а наадварот развіваюцца і пашыраюцца. На сучасным этапе-гэта адна з самых эфектыўных магчымасцяў удасканалення прафесійнага майстэрства. Выснова адна-гэта галоўная і невычэрпная крыніца захавання нацыянальнага музычнага мастацтва, якое трэба берагчы і захоўваць.

# ЛІТАРАТУРА:


1. История Беларуси в документах и материалах / сост. И.Н. Кузнецов, В.Г. Мазец.-Минск:Амалфея,2000-672с.
2. Каргин, А.С. Народная художественная культура/А.С. Каргин.-М., 1997.-176с.
3. Культура Беларуси; 20 лет развития (1991-2011):[монография] /С.П. Винокурова [и др.]; науч.ред И.И. Крук.- Минск: Институт культуры Беларуси, 2012.-327с.
4. Ожегов,С.И., Шведова, Н.Ю. Толковый словарь русского языка / С.И. Ожегов, Н.Ю. Шведова, Издательство: НТИ Технологии, 2008.-944с.